Примерная форма представления заданий, вопросов первого этапа квалификационного экзамена при прохождении аттестации учителя белорусского языка и литературы на присвоение высшей квалификационной категории

Вариативная часть:

1. Выстрайце сістэму дзейнасці педагога сучаснай школы ў лагічнай паслядоўнасці, абазначце гэтую паслядоўнасць лічбамі ад 1 да 5 у дужках насупраць кожнага з ніжэй пададзеных пунктаў:

1. Планаванне дзейнасці
2. Вызначэнне мэты (мэт) дзейнасці
3. Стварэнне ўмоў для дзейнасці
4. Аналіз вынікаў дзейнасці
5. Ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці.

1 <u>бал</u>

2. Падкрэсліце правільны адказ на пытанне: *што называем развіццём?*

Працэс развіцця чалавека як сацыяльнай істоты пад уддзеяннем усіх фактараў;
Працэс і вынік колькасных і якасных змен ў арганізме, псіхіцы, інтэлектуальнай і духоўнай сферы чалавека, абумоўлены ўплывам знешніх і ўнутраных фактараў, што паддаюцца ці не паддаюцца кіраванню імі:
Мэтанакіраваны і арганізаваны працэс фарміравання асобы;
Накіраванае на чалавека ўздзеянне дзеля фарміравання ў яго пэўных ведаў.

1 <u>бал</u>

3. Выберыце правільны адказ на пытанне, адзначыўшы яго падкрэсліваннем: *што такое навыкі?*

Шляхі дасягнення мэты і задач навучання;
Уменні, даведзеныя да аўтаматызму, высокай ступені валодання;
Сукупнасць ідэй, у якіх выражаецца тэарэтычнае авалоданне навукай;
Авалоданне спосабамі прымянення засвоеных ведаў на практыцы.

1 <u>бал</u>

4. Запішыце коратка (да 5-6 сказаў), пра што гаворыць Вам гэтае імя : *Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка*

_____
_____
_____
_____
_____
_____

3 балы

5. Коратка пералічыце асноўныя змены, што адбыліся ў сучасным беларускім правапісе:

_____
_____
_____
_____
_____
_____
_____

1 балы

6. Знайдзіце словазлучэнне, якое ў беларускай мове адрозніваецца склонавай формай залежнага слова. Запішыце словазлучэнне па-беларуску:

а) видеть насквозь;
б) видеть в темноте;
в) видеть своими глазами;
г) видеть результаты.

2 балы

7. Вызначце тэму і ідэю паэмы Янкі Купалы “Курган” (7 клас) так, як гэтага можна патрабаваць ад вучняў. Запішыце іх:

_____
_____
_____
_____

2 балы

8. Выберыце і запішыце па-беларуску словазлучэнне, у якім катэгорыя роду назоўнікаў у рускай і беларускай мовах не супадаюць:

Белый парус;
Новая пропись;
Горькая полынь;
Военный атташе.

<u>1 бал</u>

9. Для літаратуры якога перыяду было характэрна трагічнае ўспрыманне жыцця, высокая эмацыйнасць, багатая метафарычнасць, спалучэнне высокага і нізкага, дзівоснага і звычайнага, нябеснага і зямнога, увага да жыцця звычайнага чалавека і сацыяльных праблем, зўяўленне палемічнай літаратуры як асобнага жанру? Падкрэсліце патрэбнае:

Літаратура эпохі Адраджэння;
Літаратура эпохі Сярэднявечча;
Літаратура эпохі Барока
Антычная літаратура.

<u>2 балы</u>

10. Запішыце імя кампазітара і спевака, які шмат зрабіў для папулярызацыі твораў беларускага фальклору і беларускай паэзіі, выконваючы іх на эстрадзе

<u>1 бал</u>